ПІЦЦЁ НЕ СМЯЦЦЁ...

Вярнуўшыся з арміі, Кастусь, як многія іншыя тады, запісаўся на курсы шафёраў, атрымаў правы. Пасля гэтага ў яго з'явіліся праца, грошы і новыя сябры. З імі можна было хадзіць у кіно ды на танцы, ці выпіць гарэлкі. Ды каб чарку-другую, а то ж... сварыліся на Косцю бацькі.

Неяк раз вяртаецца ён з гулянкі (дома ўсе ўжо спяць), а яго, як на ліха, смага душыць. Улукаткі зайшоў у кухню (п'яны то п'яны, а помніў, што на прыпечку кампот стаіць — з сушаных яблычкаў). Абмацаў гаршчок, што называецца, прылажыўся ды заваліўся спаць.

Раніцай падымаецца на працу ісці, але ж спачатку маці паснедаць кліча. А заадно пытаецца:

— І каму гэта надурыла пойла цялячае выпіць?

— А дзе яно было? — не разумее Косця.

— Як дзе? У гаршчэчку на прыпечку.

— Дык там жа кампот заўсёды стаяў...

— Ён і цяпер стаіць...

— А я што ноччу выпіў?!

За сталом грымнуў смех.

— Малайчына, сынок, — «пахваліла» маці. — Ты ўжо цялятка стаў аб'ядаць. Так, крый бог, і да свінак дойдзеш, бо гарэлка яна такая: да добрага не давядзе, а вось да дурнога... На суседа вунь паглядзі...

Пагаварылі так бацькі ды чамусьці ўспомнілі, як Косця, малы, гуляў са стальным абручыкам і неяк жа прымудрыўся яго на шыю ўздзець: туды жалязяка лёгка ўскочыла, а вось назад — аніяк...

— Паўвёскі тады на раду сабралася, — успамінаў бацька. — На шыйцы пілаваць той абруч ніяк не выпадала. Вырашылі пастрыгчы нагала — «пацяплела» як быццам. Намылілі галаву, пагалілі — усё роўна то нос замінае, то вушы... Думалі, у школу пойдзеш з «ашыйнікам».

— Падумаеш — страх вялікі, — насупіўся Косця. — Ну, хадзіў бы з «ашыйнікам» — цяпер гэта модна.

— А зручна як, — засмяяўся бацька. — На ланцуг бы зараз навязалі, можа, гарэлкі не піў бы.

— П'яніцу знайшлі, — пакрыўдзіўся сын і выскачыў з-за стала.

...Ён тады быў аматарам выпіць. А вось «прафесіяналаў» і сапраўды не лішне было б пасадзіць на нейкі ланцуг?

Галіна Нічыпаровіч,
в. Магільна, Уздзенскі раён.

КУФЭРАК АДЧЫНЯЎСЯ ПРОСТА...

Неяк перад развалам Саюза давялося пабыць у адной кампаніі, пабачыць ды паслухаць беларуса, які ў канцы вайны трапіў у палон, застаўся ў Англіі. Родныя ведалі пра яго, што жывы, — і ўсё: пісьмаў не пісалі, у размовах не згадвалі, бо скажы каму, што радня за межамі, — бог ведае, чым гэта скончыцца... Вось і маўчалі, пакуль «жалезная заслона» не рухнула. А ўжо тады — прыехаў сваяк у родную вёску.

За сталом, апроч іншага, зайшла размова пра дробныя крадзяжы — пра тое ж малако з фермы ці збожжа з гумна...

Здзівіўся прыезджы: «А як гэта?»

Яму кажуць, што ўсё ж вакол калгаснае... І пытаюць: «А ў вас хіба не так?»

Адказ «англічаніна» прымусіў мяне яшчэ больш запаважаць тэхнічны прагрэс. Рэч у тым, што працаваў наш зямляк на кандытарскай фабрыцы, дзе вытворчасць была добра аўтаматызаваная. Гэта значыць, што «дозы» ўсіх кампанентаў адмяралі аўтаматы. «І калі ў выраб не трапляла пэўная колькасць прадукту, — расказваў зямляк, — канвеер проста спыняўся. З-за чаго і з-за каго — знаходзілі тут жа».

Амаль у той жа час мая знаёмая працавала на камбінаце кааператыўнай прамысловасці, дзе выпякалі хлеб, баранкі, кексы... «Цягнулі мы ўсяго патроху», — расказвала жанчына. — «А як жа ахова? — здзівіўся я. — Чаму прапускала?» — «А чаму б не прапускаць, калі ў сумках нічога... Мы іншае прыдумалі. За агароджай раслі кусты вербалозу і сярод іх — адзін клён. Перад канцом змены самыя смелыя беглі да плота, адсоўвалі гнілаватую дошку, пераразілі на іншы бок. І ўжо там падвешвалі на дрэва торбачкі з крадзеным. Зручна: з-за лістоў ды кустоў ніхто нічога не бачыць, сабакі не дастануць... А пасля змены можна смела выйсці за прахадную і ўсё забраць.

Ведалі пра гэты «канал» нямногія людзі, — працягвала жанчына, — і ўсё ішло добра, пакуль аднойчы торбачкі... не зніклі. Не аказалася іх і ў наступную змену. Сталі пільнаваць. Бачым — з гэтага боку да лаза ніхто не падыходзіць... Значыць, з таго... Але хто?

Таямніца адкрылася зусім нечакана. Неяк на камбінат прыйшла былая работніца, якую мусілі пайсці на пенсію. А ёй так крыўдна было, што нехта застаўся, што па-ранейшаму зарабляе ды яшчэ і крадзе... Яна ведала як... Ну і здымала».

«Чым жа гэта скончылася?» — пацікавіўся я. — «А тым, што на камбінат прыйшоў новы дырэктар, паставіў агароджу з бетонных пліт. А потым і новае абсталяванне, з якім ужо не ўкрадзеш».

Вось так. Куфэрак адчыняўся проста...

Валерый Гаўрыш,
г. Чавусы.

ВЯРТАННЕ БЛУДНАГА МУЖА

Кожная нешчаслівая сям'я нешчаслівая па-свойму — заўважыў некалі класік. Шчасце маіх суседзяў Зосі і Андрэя некалі рассыпалася, як той картачны домік, а потым...

Зрэшты, пачынаць прыйдзецца здалёк.

Некалі мой сусед Андрэй уладкаваўся працаваць шафёрам у будаўнічым трэсце. Спачатку быў, што называецца, на падхваце: з банка ды ў банк вазіў бухгалтарак, па справах — намеснікаў і толькі потым — самога кіраўніка. А што — праца не пыльная, Андрэю падабалася. Тым больш што шэф паспрыяў сям'і ў атрыманні добрай кватэры. Ён жа, ідучы на нейкую нараду, не прымушаў кіроўцу тупа чакаць, пакуль яна скончыцца, а моўчкі дазваляў «пабамбіць», гэта значыць на казённай машыне зарабіць сабе грошай. У сям'і, дзе расло двое жэўжыкаў, яны заўсёды былі дарэчы, а калі стала здавацца, што ўжо і дастаткова, Андрэй стаў крыху зацiскаць... На ўсякі пажарны... Нібы ведаў, што выпадак такі надарыцца.

І сапраўды: на нечым пагарэў-такі ягоны шэф-дабрадзей — паляцеў з пасады. Следам за ім без працы застаўся кіроўца. Трохі патаксаваў на сваёй машыне, як на казённай. Не дзіва, што дабіў (бо нешта паправіць прывычкі не меў), а горш за тое — учыніў аварыю, на два гады пазбавіўся правоў. І вось тут ужо сарваўся — стаў выпіваць. Штодня...

Скончылася гэта банальна: жонка сабрала ягоныя рэчы і выставіла за дзверы.

Вось так Андрэй апынуўся ў сваёй старой аднапакаёўцы — нядобрай кватэры, бо хутка ўсе п'яніцы ведалі, што ў ёй можна выпіць, пагуляць у карты і нават паспаць. Гаспадар за гэта мала браў — выпіць ды нешта з'есці. Ён лічыў, што вось так нават эканоміць — не траціць сваю заначку.

Яе, пакуль жыў з сям'ёй, Андрэй трымаў у гаражы. Цяпер — пабаяўся, што жонка знойдзе, і перанёс у кватэру. Схованку зрабіў у канапе, якую на першым годзе сямейнага жыцця прывезлі з камісійнай крамы і ў якой ад былых гаспадароў засталася праедзеная мышамі дзірка ў тканіне, што абцягвала спінку ззаду. Туды спакойна пралазіў кулак... Андрэю заставалася купіць адмысловых цвікоў, прыбіць імі тканіну па перыметры і адзін цвічок «адкусіць», каб той абы трымаўся ў рэйцы.

Карацей, схованка была — лепш не трэба! Як яму здавалася. Але ж...

Недзе праз месяц бадзяжнага жыцця Андрэй з пнеўманіяй загрымеў у бальніцу. Жонка ды дзеці, пачуўшы пра гэта, ну вядома ж, захацелі наведаць — і яго, і потым сваю былую кватэру, навесці там нейкі парадак і ўрэшце... выкінуць старую канапу.

— Можа, ранавата яе на сметнік? — спытала адна з суседак, пачуўшы шум.

— Самы раз, — адказала Зося. — У кватэры яшчэ адна ёсць — лепшая.

— А можна гэту я забяру? На дачу.

— Ды калі ласка!

Жонка — дазволіла, а вось Андрэй, пачуўшы пра гэта, як не звар'яцеў: раззлаваўся, пакрыўдзіўся, а галоўнае, тут жа... паправіўся — папрасіўся дамоў.

...Суседка — не старая яшчэ ўдава — убачыўшы ў вочка, што цвярозы, дзверы яму адчыніла. (Канапа стаяла ў калідоры. Андрэй аж сеў на яе з той радасці.)

Гаспадыня прапанавала грошы (хоць старая, але ўсё ж такі мэбля). «Госць» адмовіўся, а вось чаю — дык папрасіў.

Жанчына, здзівілася, рушыла ў кухню. Андрэй застаўся на канапе — газеты пачытаць. А сам, улучыўшы момант, апусціў руку за спінку, абмацаў запаветны цвічок... Заначка была на месцы! Забраў! Рукі засвярбелі ўсё пералічыць.

Так што ў гасцях ён не затрымаўся — пакіраваў да сябе, стаў думаць, куды ж схаваць грошы. А ў дзверы тым часам ужо званілі: былыя «сябрукі», убачыўшы ў вокнах святло, прыйшлі выпіць за яго здароўе!

Але Андрэй не адчыняў, ён ашалела насіўся па кватэры. Пакунак з грашыма засунуў у дзірку пад ваннай, потым — пад духоўку, на антрэсолі, пад плінтус, у старую бляшанку з крупамі, у кішэнь паліто, пад трубу ўнітаза, пад газеты між аконнымі рамамі...

У першым месцы яго кроўныя (не з неба ж звяліліся — зарабіў, для сябе, для дзяцей!) маглі размокнуць, у другім — згарэць, у трэцім, пятым, дзясятым на іх маглі напароцца сябры-сабутэльнікі, што для грошай не лепш, чым вада і агонь...

А таму, заціснуўшы пад пахай пакунак з добрай тысячай долараў, Андрэй паехаў да жонкі.

...Па чарзе потым расказвалі, як ён перапрашаў ды каяўся. «Ну хоць ты карціну пішы — пад назвай «Вяртанне блуднага мужа», — смяялася Зося...

І таму, сказаўшы сваё цвёрдае: «Да першай п'янкі», усё даравала.

З тога самага дня Андрэй і трымаецца: знайшоў работу. І не п'е — каторы гадок... Нават на вяселлях дзяцей.

В. Сідарэвіч,
г. Бабруйск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ДУМКІ Ў СЕЦІВЕ НАРАДЖАЮЦЬ ПАЧВАР

Аб уласнай канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі

ПРЫНЯТАЯ на гэтым тыдні Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі нашай краіны выклікала вялікую цікавасць і хвалю абмеркаванняў. Што, уласна, і не дзіўна: у век развітых высокіх тэхналогій, калі інфармацыя распаўсюджваецца хутчэй, чым святло, кожная дзяржава, якая хоча застацца незалежнай, павінна ўмець сябе і ў гэтам плане абараніць. За краіну цяпер можна быць спакойным — прадугледжаны інструменты і рычагі гэтай абароны. Чаго не скажаш пра асабістую інфармацыйную бяспеку яе насельнікаў — нас з вамі, актыўных карыстальнікаў усіх найноўшых дасягненняў тэхнічнага прагрэсу. Клапаціцца аб якой павінны мы самі. Пакуль што гэтага разумення ў многіх з нас, на жаль, няма. Чым гэта можа скончыцца? У нашым, дробна-ўласным маштабе — таксама стратай незалежнасці і разбурэннем. Асобы, сям'і, кар'еры, жыцця — гэта ўжо як «пашанцуе».

Я ўпершыню зрабіла такую выснову, здавалася б, відавочную, літаральна днямі, калі, пачытаўшы вельмі сумнеўны з пункту гледжання прыстойнасці пост адной са сваіх сеткавых сяброўак (і па прывычцы ўсміхнуўшыся: што з яе возьмеш, яна і ў кампаніі такая, бывае, як ляпне што), звярнула ўвагу на каментарыі, якія ёй на гэты пост пісалі зусім незнаёмыя людзі. Чаго там толькі не было! Пачынаючы ад абраз знешнасці да жадання заняцца з ёй, выбачайце, сексам у вычварэнскіх формах і пагроз знайсці яе і гэта самае жаданне ажыццявіць. Сяброўка вельмі хутка свой пост разам з каментарыямі са старонкі прыбрала, але дзе гарантыя, што хтосьці з хворых на галаву ці, наадварот, вельмі разумных наведвальнікаў яе акаўнта (а доступ ёсць для ўсіх ахвотных — заходзь хто хоча, глядзі і пішы што хочаш) не захаваў скрыншот яе старонкі ў сябе на камп'ютары. Дзеля чаго? Напрыклад, дзеля таго, каб падпільнаваць яе дзе ў завуголлі (гэта ў «хворым» выпадку). Ці, калі штосьці ад сяброўкі будзе трэба (не аддаваць ёй буйную пазыку, напрыклад, або каб яна саступіла больш выгаднае месца на працы, або проста адпомсціць за нейкую крыўду), проста тую захаваную старонку выцягнуць на свет божы (гэта ў выпадку «занадта разумным»). І ў адным, і ў другім варыянце пацярпелай будзе толькі аўтарка таго легкадумнага поста. І ўпраўленне «К» да гэтай справы не прыцягнеш — прыкмет віртуальнага злачынства тут не відаць, хіба што прыкметы элементарнай віртуальнай дурасці і неабачлівасці.

НА хвалі гэтых разважанняў я пачала вывучаць у адной з сацыяльных сетак публікацыі сваіх «фрэндаў». Да гэтага разглядала тое, што яны пішуць, як фрагменты нашай асабістай размовы — сам-насам ці ў вельмі цеснай кампаніі блізка знаёмых людзей, дзе можна пра што заўгодна — і пра інтымнае жыццё, і пра грошы, і пра тое, што раздражняе, і бялізнай новай пахваліцца, і з нейкай няёмкай сітуацыі пасмяяцца, і самыя правакацыйныя думкі выказаць... А цяпер прыйшло (лепш позна, чым ніколі!) разуменне: публікаваць штосьці на асабістай старонцы ў сеціве — тое самае, што крычаць усё гэта ў рупар на вялізнай-вялізнай плошчы, напоўніцу набітай людзьмі. У большасці сваёй гэта людзі выпадковыя, але што перашкодзіць ім, калі штосьці ў тваім выступленні не спадабаецца, сцягнуць цябе з трыбуны ды яшчэ і закідаць камянямі?..

Пасля дзівімся: чаму пасля выдатнага, здавалася б, сумоўя, работадаўца адмовіў у месцы? А ён проста праманіторыў тваю старонку «УКантакце», а там... Ды яму магло не спадабацца што заўгодна: спасылка на блатную песню з пазнакай «Амаль пра мяне», фота ў сямейных трусах, танцы на стале на навагодняй вечарыне — тое, што выклаў у сеціва «па прыколе», каб падзяліцца з «фрэндамі», пра што ўжо і не памятаеш. А яно боўталася недзе ў бязмежным чэраве інтэрнэту і выплыла ў самы непрыдатны момант. Сёння ты пакпіў у сваім акаўнце са знешняга выгляду сцюардэс авіякампаніі, а заўтра гэта самая авіякампанія ўносіць цябе ў свой «чорны спіс» і білетаў на вельмі патрэбны табе рэйс не аказваецца... Рэаліі віртуальнага жыцця.

НЯДАЎНА прачытала з гэтай нагоды цікавае даследаванне — як людзі самі фактычна разбурылі сваё жыццё адной публікацыяй у сацыяльных сетках. Прыклады ў ім замежныя, але ж мы ўсе — дзеці планеты Інтэрнэт. Амерыканка, якая з Нью-Ёрка ляцела на поўдзень Афрыкі, седзячы ў самалёце, жартам напісала на сваёй старонцы: «Спадзяюся, не захварэю на СНІД. Жартую. Я ж белая». Гэтыя тры фразы каштавалі ёй кар'еры ў вядомай карпарацыі, яе прозвішча стала сінонімам расізму, яе пагражалі забіць, каб вярнуць добрае імя, яна працавала валанцёрам у адным з найбяднейшых раёнаў Эфіопіі. Іншая яе суайчынніца зрабіла «прыкольнае» фота ля манумента загінулым воінам і выклала на старонцы ў «Фэйсбуку». Вынік — засталася без працы, атрымлівала пагрозы, паўтара года не выходзіла з дому, лячылася ад дэпрэсіі... А жыхар Лондана перад паездкай у ЗША напісаў на сваёй старонцы аб сваіх планах «парваць» Амерыку. Пакуль даляцеў, яго ўжо чакалі супрацоўнікі спецслужбаў. І сустрэлі як патэнцыйнага тэрарыста. У прамых і пераносных значэннях разбірацца ніхто не стаў. Праўда, пасля небараку вызвалілі-такі, але ўезд у ЗША забаронены яму на ўсё астатняе жыццё.

НА пачатку 2000-х ад прафесара журналістыкі Ясена Засурскага давялося пачуць азначэнне інтэрнэту: маўляў, гэта плот, на якім напісана непрыстойнае слова, якое чытаюць усе, хто ідзе міма, але нікому дакладна невядома, хто яго напісаў. Прайшло няшмат часу, а ўжо ўсё па-іншаму: пра аўтара не толькі даведаюцца — знойдуцца і тыя, хто яго ў спісаны плот з асалодай тыцне носам.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.